ЮРЫЙ ЛУПІНЕНКА

# Рэканструкцыя знешняга выгляду вяроў Вялікага Княства Літоўскага XVII ст.

## 1. ТАВАРЫШ ПАНЦЫРНАЙ ХАРУГВЫ ВОЙСКА ВЯЛІКАГА КНЯСТВА ЛІТОЎСКАГА. СЯРЭДЗІНА XVII СТ.

Вершнік апрануты ў чырвоны жупан, сінія нагавіцы, жоўтыя боты. Даспех складаецца з панцыра, місюркі з барміцай, наручаў-карвашоў. Ваяр даволі разнастайна ўзброены. Агняпальную зброю складаюць прымацаваная да сядла ў скураных ольстрах (кабурах) пара калясцовых пісталетаў калібрам 14 мм і вагой 1,4 кг кожны. Халодная зброя: вошчап (кап'ё), сагайдак з лукамі і стрэламі, шабля. Канём вершнік кіраваў з дапамогай нагайкі.

Пераважную частку асабовага складу панцырных харугваў складалі жыхары Рэчы Паспалітай.

## 2. ШАРАГОВЕЦ ДРАГУНСКАГА ПАЛКА ВОЙСКА ВЯЛІКАГА КНЯСТВА ЛІТОЎСКАГА. СЯРЭДЗІНА XVII СТ.

Жаўнер апрануты ў жустакор цёмна-блакітнага колеру, нагавіцы, боты-батфорты з астрагамі, шапку-футраванку, пальчаткі, лёгкі скураны даспех — калет. Драгун узброены калясцовым карабінам калібрам 14 мм і вагой 3,5 кг, які трымаецца на цеpазплечнай панталеры, парай калясцовых пісталетаў калібрам 14 мм і вагой 1,4 кг, кожны ў прымацаваных да сядла скураных ольстрах. Цераз плячо перавешана ладунка з набоямі, натруска, ключ для ўзвядзення зброі. З халоднай зброі драгуны ўжывалі шаблі ці шпагі. Паводле нацыянальнага складу драгунскія палкі збольшага складаліся з жыхароў Рэчы Паспалітай.

**Юрый Лупіненка** — гісторык-аматар з Гомеля, актыўны ўдзельнік вайскова-гістарычных клубаў, прысвечаных часам Сярэднявечча і Другой сусветнай вайны. Сфера зацікаўленасцяў — вайсковая гісторыя і матэрыяльная культура Беларусі.

## 3. АФІЦЭР І ШАРАГОВЕЦ ПАЛКА НЯМЕЦКАЙ ПЯХОТЫ ВОЙСКА ВЯЛІКАГА КНЯСТВА ЛІТОЎСКАГА. СЯРЭДЗІНА XVII СТ.

Абодва ваяры апранутыя ў стандартную вопратку: жустакоры светла-вохрыстага колеру з чорнымі вылогамі, чорныя фетравыя капелюшы, шыйныя хусткі, нагавіцы-рэнгравы, панчохі. Афіцэр абуты ў боты, яго вылучаюць шалік і пер’е на капелюшы. Шараговец абуты ў чаравікі.

Стралок мае на ўзбраенні кнотавы мушкет з сошкай калібрам 19 мм і вагой 4,6 кг, шпагу. Рыштунак для стральбы: меркі з порахам (апосталы), торбачка з кулямі, натруска, запас кноту і іншае, трымаецца на шырокай бандальеры.

Афіцэр узброены пратазанам ды шпагай.

Гучыць каманда: «Цэлься!»

Нягледзячы на назву, нацыянальны склад нямецкай пяхоты быў разнастайны. На афіцэрскія пасады часцей за ўсё траплялі адукаваныя спецыялісты з Заходняй Еўропы.

## 4. ТАВАРЫШ ГУСАРСКАЙ ХАРУГВЫ ВОЙСКА ВЯЛІКАГА КНЯСТВА ЛІТОЎСКАГА. СЯРЭДЗІНА XVII СТ.

Вершнік апрануты ў ярка-жоўты жупан, чырвоныя нагавіцы, жоўтыя боты з астрагамі.

Даспех складаецца з панцыра, кірасы, гаржэта, наплечнікаў, наручаў-карвашоў, шышака з плюмажам. Зверху даспеха, цераз плячо, перакінутая накідка са скуры рысі.

Гусар узброены «дрэўцам» даўжынёй 5,5—6 метраў з доўгім прапарцом, шабляй і канчарам.

Гусарскія харугвы амаль выключна складаліся з жыхароў Рэчы Паспалітай. Нягледзячы на замацаваны стэрэатып, большасць гусараў Рэчы Паспалітай не ўжывалі заплечных крылаў, прызначэнне якіх да гэтага часу дыскусійнае.

## 5. ШЛЯХЦІЧ З ПАВЯТОВАЙ ХАРУГВЫ І ХАРУЖЫ МЯШЧАНСКАЙ ХАРУГВЫ ВЯЛІКАГА КНЯСТВА ЛІТОЎСКАГА. ПЕРШАЯ ПАЛОВА — СЯРЭДЗІНА XVII СТ.

Шляхціч апрануты ў барвовы жупан, блакітны кунтуш, нагавіцы, шапку-футраванку з плюмажам і срэбным аграфам, жоўтыя боты, шаўковы кушак. На руках наручы-карвашы.

Мешчанін апрануты ў зялёны жупан, кушак, нагавіцы, чорныя боты, шапку-футраванку.

Абодва ваяры ўзброеныя шаблямі, калясцовымі пісталетамі калібру 14 мм і вагою 1,4 кг. З рыштунку маюць ладункі з набоямі, натрускі, ключы для ўзвядзення пісталетаў.

Палотнішчы харугваў мяшчан ВКЛ, відаць, былі аналагічныя польскім. Яны ўяўлялі з сябе пяхотныя тактычныя харугвы памерам 2x3 метры, з касым крыжам на светлым полі і цэхавай ці гарадской эмблемай у цэнтры.

1



2



**3**



4



5

